УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Бел)я73
К666

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук БДПУ
(пратакол № 7 ад 29.03.05)

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А. П. Жытко;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ *П. А. Тупік*

**Корзюк, А. А.**
К666 Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII – пачатак XX ст.) : метад. дапам. / А. А. Корзюк; пад навук. рэд. І. І. Багдановіча. — Мн. : БДПУ, 2005. — 47 с.

У дапаможніку прапанаваны разнастайныя варыянты ўрокаў, змешчаны праблемныя заданні. Даюцца фрагменты з твораў мастацкай літаратуры. Выкарыстаны вопыт вывучэння ваенна-гістарычнага і культурна-гістарычнага матэрыялаў.
Адрасуецца студэнтам гістарычнага факультэта БДПУ.

УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Бел)я73

© Корзюк, А. А., 2005
© ВВЦ БДПУ, 2005

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

А. А. Корзюк

# ШЛЯХІ ФАРМІРАВАННЯ ПАЗНАВАЛЬНАГА ІНТАРЭСУ ВУЧНЯЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ШКОЛЕ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX ст.)

*Метадычны дапаможнік*

8991
бібліятэка
БДПУ імя М. Танка

Мінск 2005

Адначасова гучыць мелодыя песні на словы Я.Купалы "Малітва" ў выкананні У.Мулявіна.

Урок завяршаецца фармулёўкай вываду і рэфлексіяй яго ўдзельнікаў.

У якасці хатняга задання 5 узроўня можна прапанаваць вучням скласці параўнальную табліцу "Нацыянальна-вызваленчыя паўстанні ў Польшчы, Літве і Беларусі 1794, 1830 – 1831 і 1863 – 1864 гг." па самастойна вызначаных крытэрыях.

**Тэма "Становішча Беларусі ў гады Першай Сусветнай вайны." (§27).**

У ходзе ўрока вучні павінны ўспомніць і паўтарыць з курсу сусветнай гісторыі 8 класа прычыны і ўдзельнікаў вайны (§§ 28, 42), прааналізаваць яе ход на тэрыторыі Беларусі, ўплыў на становішча беларускіх зямель, высветліць захопніцкі характар вайны і зразумець, як яна паўплывала на абвастрэнне рэвалюцыйнага крызісу ў Расіі.

Урок мае шырокія магчымасці для ўдасканалення навыкаў характарыстыкі войнаў і баявых дзеянняў, вызначэння яе характару, выкарыстання міжкурсавых сувязей, сінхранізацыі падзей айчыннай і сусветнай гісторыі, храналагічных і картаграфічных уменняў вучняў; а таксама выхавання ў вучняў гуманістычнага светапогляду, непрыняцця насілля і жорсткасці.

Вывучэнне тэмы ўрока будуецца ў адпаведнасці з планам-памяткай характарыстыкі вайны і праходзіць у форме тлумачэння настаўніка, а потым – самастойнай работы вучняў пры выкарыстанні падручніка і карты "Первая мировая война".

1.Прычыны і пачатак вайны.

Пабудова блок-схемы і работа з ей (мал.1):

Барацьба за перадзел свету

Антанта
**1907**
(Англія, Францыя, Расія)

Траісты саюз
**1882**
(Германія, Аўстра-Венгрыя, Італія)

**1 жніўня 1914** - пачатак вайны



2.Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі.

Пабудова лагічнага ланцужка па матэрыялу пункта 2 §27 з адначасовай лакалізацыяй падзей на карце Беларусі і на карце, змешчанай на стар. 233 падручніка (мал.2):

Жнівень 1915 г. – нямецкае наступленне ў накірунку Коўна – Вільня
↓
14 верасня 1915 г. - захоп г.Вілейкі
↓
Перарэзана чыгунка Мінск – Масква ў раене Смалявіч
↓
Адступленне рускіх войск з Заходняй Беларусі
↓
Перавод Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага з Баранавіч у Магілеў
↓
16-17 верасня – Свянцянскі прарыў расійскай арміі
↓
Кастрычнік 1915 года – стабілізацыя фронту па лініі Дзвінск – Паставы – Баранавічы – Пінск
↓
Пазіцыйная вайна

3.Становішча на тэрыторыі Беларусі ў час вайны.

Арганізацыя работы вучняў па вывучэнню тэкста параграфа падручніка ў 4 мікрагрупах:

1 мікрагрупа – Бежанства і ваенныя павіннасці насельніцтва (пункт 3);
2 мікрагрупа – Рабочы і сялянскі рух (пункт 5);
3 мікрагрупа – Гаспадарчая разруха (пункт 4);
4 мікрагрупа – Беларускі нацыянальны рух (пункт 7).

**Заданне:** вылучыць галоўныя рысы і асаблівасці вывучаемых аспектаў, запісаць іх у сшытак і сфармуляваць вывад.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ